Аўсейчык, У.Я. Дынаміка змен у пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння ў 1-й палове XX ст. / У.Я. Аўсейчык // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі / НАН Беларусі, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры; навук. рэд. А.І. Лакотка. – Мінск: Права і эканоміка, 2012. – Вып. 13. – С. 325–331.

***Аўсейчык У.Я.***

# ДЫНАМІКА ЗМЕН У ПАХАВАЛЬНА-ПАМІНАЛЬНАЙ АБРАДНАСЦІ БЕЛАРУСАЎ ПАДЗВІННЯ Ў ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XX СТ.

*Установа адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт»*

У першай палове XX ст. пахавальна-памінальная абраднасць беларусаў Падзвіння, як і ўся народная культура, развівалася ў новых умовах і зведала істотныя перамены. На пачатак XX ст. беларускі этнас можна яшчэ ахарактарызаваць як супольнасць традыцыйнага тыпу [12, с. 70]. Аднак працэс разбурэння традыцыйнай беларускай культуры, паскораныя тэмпы якога назіраюцца ў XX – пачатку XXI ст., пачаўся яшчэ ў другой палове XIX ст. Грамадска-палітычныя і сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні ў гэты час пацягнулі за сабой і трансфармацыю народнай культуры беларусаў. Яны закранулі і найбольш устойлівыя да змен абрады сямейнага цыкла, на што неаднаразова звярталі ўвагу этнографы. Так, Е.Р. Раманаў адзначаў пранікненне ў радзінную паэзію беларусаў песень літаратурнага паходжання, а таксама тэкстаў іншых народаў [20, с. 337]. М.М. Улашчык згадваў пра знікненне з вясельнай абраднасці беларусаў в. Віцкаўшчыны Мінскага павета шэрагу традыцыйных элементаў і з'яўленне замест іх новых [23, с. 64]. Падобная тэндэнцыя была характэрна і для пахавальна-памінальнай абраднасці. Адзін з карэспандэнтаў П.В. Шэйна Кунцэвіч у канцы XIX ст. пісаў пра знікненне з пахавальнай абраднасці беларусаў Люцынскага павета Віцебскай губерні шэрагу элементаў у параўнанні з ранейшым часам. На такую асаблівасць, па словах карэспандэнта, звярталі ўвагу і самі сяляне [24, с. 528]. Пра змены ў пахавальнай абраднасці беларусаў («ачышчэнне ад язычніцкіх перажыткаў») пад уплывам духавенства і школы ў канцы XIX ст. пісаў і А.Я. Багдановіч [6, с. 53].

Заўважныя змены ў пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння адбыліся на пачатку XX ст. У сувязі з рэвалюцыйнымі падзеямі 1905–1907 гг. на тэрыторыі Беларусі, як і на астатняй тэрыторыі Расійскай імперыі, з'явіўся новы тып пахавальнага абраду, які Н.С. Палішчук ахарактарызавала як *«пахаванні-дэманстрацыі»* [18, с. 26]. Па такому абраду хавалі пераважна «ахвяр царызму», г. зн. загінуўшых рэвалюцыянераў у час разгону дэманстрацый і сутыкненняў з урадавымі сіламі [18, с. 26].

Прыкладамі «пахаванняў-дэманстрацый» на беларускай тэрыторыі з'яўляюцца пахаванні загінуўшых у час кастрычніцкіх падзей 1905 г. у Віцебску і Полацку. 18 кастрычніка 1905 г., у дзень абвяшчэння маніфеста Мікалая II «Аб удасканаленні дзяржаўнага парадку», у Віцебску казачы патруль адкрыў стральбу па ўдзельніках мітынгу, якія сабраліся слухаць маніфест. У выніку 7 чалавек былі забіты, чацвёра – паранены. На наступны дзень у адказ сабралася 20-тысячная дэманстрацыя пратэсту, а ў дзень пахавання забітых каля 40 тысяч чалавек

прынялі ўдзел у пахавальным шэсці [11, с. 241]. У сувязі з маніфестам 18 кастрычніка сабраўся мітынг у Полацку. Паліцыя і салдаты акружылі мітынгуючых і пачалі стральбу. У выніку, па афіцыйных даных, было забіта 7 і паранена 9 удзельнікаў. Сярод забітых было 6 яўрэяў і 1 праваслаўны. На наступны дзень адбылося пахаванне загінуўшых яўрэяў, а яшчэ праз дзень хавалі тэлеграфіста П. Шалкоўскага (праваслаўнага) [5, с.117; 2, с. 83].

У дадзеных пахаваннях змены датычыліся пераважна публічнай часткі абраду – пахавальнай працэсіі да могілак. Пахавальнае шэсце часткова мяняла свае функцыі і фактычна пераўтварылася ў палітычную антыўрадавую дэманстрацыю. Характэрнай асаблівасцю грамадзянскіх пахавальных шэсцяў у Полацку і Віцебску стала прамаўленне воклічаў, спяванне рэвалюцыйных песень, удзел духавога аркестра, наяўнасць сцягоў, вянкоў і транспарантаў, а таксама шырокае распаўсюджанне матэрыяльнай атрыбутыкі чырвонага колеру (чырвоныя сцягі, вянкі, стужкі) як рэвалюцыйных сімвалаў [5, с. 117; 11, с. 241; 2, с. 83]. Апошняя асаблівасць даволі прынцыповая і паказальная, паколькі чырвоны колер не стасуецца з традыцыйнай жалобнай колеравай гамай беларусаў і ўвогуле ўсходніх славян [21, с. 248]. Неад’емным элементам грамадзянскага пахавання з’яўляўся мітынг, які адбываўся на могілках ці па дарозе да месца пахавання [5, с. 117; 2, с. 83].

У сувязі з рэвалюцыйнымі падзеямі пачатку XX ст. у краіне пашыранымі становяцца вулічныя дэманстрацыі, мітынгі і маніфестацыі. Іх колькасць значна ўзрастае пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. У ходзе гэтых вулічных выступленняў заўважнае месца адводзілася паміnанню загінуўшых рэвалюцыянераў. Нярэдка мітынгі і дэманстрацыі праводзіліся адмыслова для памінання «ахвяр царызму». Асаблівасцю такіх памінанняў быў іх грамадзянскі характар, выкарыстанне «чырвонай» сімволікі (чырвоны колер нярэдка дапаўняўся чорнай жалобнай стужкай), удзел аркестра. Так, 10 сакавіка 1917 г. у Віцебску адбылася дэманстрацыя, якая была прысвечана памяці загінуўшых рэвалюцыянераў. У час яе салдаты прынялі новую прысягу, а над імі раздзімаўся чырвоны сцяг з чорнымі літарамі: «Вечная память павшим за свободу» [8, с. 137]. Падчас першамайскай дэманстрацыі 1917 г. у Оршы прадугледжваўся мітынг каля магіл «змагароў за свабоду». Кіраўніцтва шэсця на могілкі ўскладалася на спецыяльны выканаўчы камітэт, а яго парадак павінны былі вызначаць «дэпутаты», якія мусілі мець на рукаве чырвоную павязку. У шэсці павінен быў удзельнічаць аркестр [8, с. 190].

Прыведзеныя вышэй прыклады новых форм пахавальнага і памінальнага абрадаў былі адзінкавымі. Яны датычыліся канкрэтнай катэгорыі памерлых – загінуўшых рэвалюцыянераў і бытавалі ў поліэтнічным гарадскім асяроддзі. А таму гэтыя змены хоць і з’яўляліся прынцыповымі і знакавымі, але не былі паказальнымі ў кантэксце традыцыйнай пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў.

Значныя змены адбыліся ў сферы пахавальна-памінальнай абраднасці пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. З усталяваннем савецкай улады ў краіне ўстанаўліваецца і новая сістэма святочных дзён і абрадаў. Спачатку атрымалі распаўсюджанне публічна-грамадзянскія абрады, звязаныя з рэвалюцыйнымі

святамі (Дзень Інтэрнацыянала, Дзень пралетарскай рэвалюцыі, Дзень памяці 9 студзеня, Дзень звяржэння самадзяржаўя, Дзень Парыжскай Камуны, Дзень Чырвонай Арміі). У гэты перыяд ажыццяўляліся спробы разам з публічна-грамадзянскімі абрадамі ўкараніць ў побыт насельніцтва і новыя сямейныя абрады. У пачатку 1920-х гг. з'яўляюцца прыклады правядзення сямейных абрадаў па новаму рытуалу. Новыя сямейныя абрады сталі насіць назву «чырвоных». Так, узніклі «чырвоныя» хрэсьбіны («акцябрыны»), «чырвонае» («камсамольскае») вяселле. Разам з імі з'яўляецца і новы «чырвоны» пахавальны абрад.

Перыядычныя выданні міжваеннага перыяду змяшчаюць шэраг апісанняў новых «чырвоных» пахавальных абрадаў на Беларусі. Варыянты «чырвоных» пахаванняў, як вынікае з гэтых апісанняў, нягледзячы на істотныя і бачныя змены, працягвалі захоўваць структуру традыцыйнага абраду пахавання. «Сінтаксічная памяць» (азначэнне, прапанаванае В.В. Глебкіным [9, с. 137]) аб ранейшым абрадзе працягвае вызначаць структуру і паслядоўнасць абрадавых дзеянняў у новым рытуале. Змены, як правіла, датычыліся зместу і семантыкі асобных частак і элементаў рытуалу. Пры гэтым трэба адзначыць, што замена ў шэрагу выпадкаў магла насіць чыста механічны характар. Так, у новым рытуале традыцыйнае развітанне на могілках замяняе мітынг з урачыстымі прамовамі, а малітвы і адпяванні святаром – спяванне рэвалюцыйных песень ці гучанне пахавальнага маршу [16, с. 365; 13, с. 4].

Новыя «чырвоныя» пахаванні праходзілі без удзелу святароў. У шэрагу выпадкаў толькі гэта з'яўлялася асноўным і бачным адрозненнем новага абраду ад традыцыйнага. Факт няўдзелу святара ў пахаванні быў даволі прынцыповым і паказальным. Гэта праявілася нават у намінатыўным аспекце новага грамадзянскага абраду пахавання. Правядзенне рытуалу па-новаму азначала (а таму і называлася) «пахаванне без папоў» [13, с. 4; 22, с. 5]. Характэрнай рысай грамадзянскіх пахаванняў, якія праводзіліся на Віцебшчыне ў 1920-я гг., стала выпадзенне са структуры абраду і тых элементаў, якія насілі выключна рэлігійны характар. Прынцыповай асаблівасцю новых сацыялістычных абрадаў стала поўнае адмаўленне ад усялякай рэлігійнай атрыбутыкі. Замест яе сталі прымяняць «чырвоную» сімволіку, якая з'явілася яшчэ падчас рэвалюцыі 1905–1907 гг. Так, царкоўныя харугвы (пратэсы) замяняліся на чырвоныя сцягі і вянкі [16, с. 365; 13, с. 4].

У структуры грамадзянскіх пахавальных абрадаў, у параўнанні з традыцыйнымі, з'яўляюцца новыя часткі і элементы. Сярод іх трэба назваць клятву ці абяцанне, якія давалі прысутныя на магіле памерлага [13, с. 4]. Такая практыка бярэ свой пачатак яшчэ з пахавальных абрадаў часоў рэвалюцыі 1905–1907 гг. і грамадзянскіх памінанняў «ахвяр рэвалюцыі» дакастрычніцкага перыяду [18, с. 31].

У міжваенны перыяд новы грамадзянскі («чырвоны») абрад пахавання быў мала распаўсюджаным і бытаваў пераважна ў гарадскім асяроддзі. Аднак, як сведчаць крыніцы, ён сустракаўся і ў вёсцы [13, с. 4; 22, с. 5]. Абрад пахавання па новаму рытуалу спраўляўся толькі для знакамітых асоб і актыўных бальшавіцкіх дзеячаў. У той жа час пахаванне большай часткі насельніцтва адбывалася па

традыцыйнаму абраду, які нярэдка дапаўняўся рэлігійнымі рытуаламі [16, с. 365; 14, с. 95]. Такая практыка бытавала нават сярод бальшавіцкіх дзеячаў, пра што са шкадаваннем адзначалі карэспандэнты таго часу [3, с. 4]. Аднак, некаторыя элементы «чырвоных» пахаванняў міжваеннага перыяду даволі трывала ўвайшлі ў структуру грамадзянскага пахавальнага абраду і працягвалі выкарыстоўвацца ў далейшым. Сярод іх Т.І. Кухаронак называе выкарыстанне аркестра і грамадзянскую паніхіду [14, с. 95]. Тое ж можна сказаць і пра некаторую «чырвоную» атрыбутыку і ўвогуле саму каларыстычную гаму абрадавай атрыбутыкі (спалучэнне чырвонага і чорнага колераў), што прымянялася ў пахаванні.

Як сведчаць крыніцы, у 1920–1930-я гг. працягваецца традыцыя ўключэння элементаў памінання загінуўшых рэвалюцыянераў у мітынгі і дэманстрацыі, прымеркаваныя да важных дзяржаўных святаў (1 Мая, гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі) [7, с. 574]. Нярэдка жалобныя мітынгі праводзіліся выключна для памінання загінуўшых у барацьбе за ўсталяванне савецкай улады. У 1920-я гг. жалобныя мітынгі часта праводзіліся на магілах герояў грамадзянскай вайны, а ў 1930-я гг. – у памяць савецкіх дзеячаў, што загінулі ў часы калектывізацыі. Для такіх мітынгаў было характэрна ўскладанне кветак і вянкоў, ганаровая варта, удзел духавога аркестра [19, с. 271].

Грамадзянскія пахаванні і памінальныя ўрачыстасці ў першай палове ХХ ст. былі распаўсюджаны не толькі на тэрыторыі СССР. Яны былі пашыраныя і ў Польскай дзяржаве, у склад якой з 1921 па 1939 гг. уваходзіла заходняя частка Беларусі. Гэта сведчыць аб агульных тэндэнцыях у развіцці пахавальна-памінальнай культуры ў свеце. Грамадзянскі характар насілі пахаванні загінуўшых «жалнераў» у час савецка-польскай вайны 1919–1920 гг., а таксама ўрачыстае іх памінанне. У заходняй частцы Падзвіння мелі месца і ўрачыстыя пахаванні знакамітых і заслужаных асоб. Такія пахаванні некалькі адрозніваліся ад традыцыйнага варыянта абраду. Прыкладам з'яўляецца пахаванне ў 1926 г. браслаўскага доктара С. Нарбута [1, с. 69].

Значныя змены ў пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў адбыліся ў час Другой сусветнай вайны. Уплыў вайны на змены ў пахавальна-памінальнай абраднасці беларускага этнасу праявіўся ў двух накірунках (гэта без уліку тых працэсаў і механізмаў, што яна запусціла і якія аказвалі ўздзеянне на абрадавую культуру ў наступным). Па-першае, гэта змены, якія адбыліся ў пахавальна-памінальнай абраднасці непасрэдна ў час вайны (у структуры абраду, комплексе рэгламентацый, змесце пахавальных галашэнняў і г.д.), а па-другое – змены, якія адбыліся ўжо пасля вайны і звязаныя з ушанаваннем загінуўшых у ёй.

У час вайны адбываюцца змены ў структуры пахавальнага абраду. Ён становіцца больш спрошчаным і згорнутым. Назіраецца выключэнне з абраду як асобных элементаў, так і цэлых блокаў, што было выклікана немагчымасцю іх выканання ва ўмовах ваеннага часу. Адсутнасць магчымасці выраблять ці набываць неабходныя для пахавання рэчы прыводзіць да таго, што хаваць памерлага маглі і без іх. Нават такі прынцыповы момант, як пахаванне памерлага ў дамавіне, не заўсёды выконваўся. Па прычыне недахопу неабходных матэрыялаў для вырабу труны, яе маглі рабіць з падручных: «*А ці былі случаі,*

*што без труны хавалі? – Былі случаі, алі дзелалі хоць сколька. <...> Збілі з колікаў, жэрдзі как завецца. Выразалі, збілі, пахаранілі»* (запісана У.Я. Аўсейчыкам у 2009 г., в. Рачныя Докшыцкага р-на ад Пецько Г.С., 1931 г. н.). Выбар часу і месца пахавання памерлага ў такіх умовах мог дыктавацца не традыцыяй, а прынцыпам бяспекі: *«А як вайной харанілі? – Хавалі ціха, баяліся немцы каб не наскочылі»* (запісана У.Я. Аўсейчыкам, Шыпіла Н. і Путронкам К. у 2009 г., в. Дзедзіна Докшыцкага р-на ад Падбярэзка Л.М., 1934 г. н., Карніловіч К.І., 1933 г. н.). Нават пахаванне памерлага на могілках у гады вайны не заўсёды было магчымым: *«У лесе вайной, харанілі ў лесе. – Эта вайной такія звычаі? – Да, вайной»* (запісана У.Я. Аўсейчыкам у 2009 г., в. Рачныя Докшыцкага р-на ад Пецько Г.С., 1931 г. н.).

Некалькі падобная сітуацыя была характэрна і для часоў Першай сусветнай вайны. Выкананне абрадавых дзеянняў у гады гэтай вайны таксама значна ўскладнялася адсутнасцю неабходных для пахавання рэчаў. Асабліва такая сітуацыя была характэрная для бежанцаў, якіх у час Першай сусветнай вайны было даволі многа [26, s. 117, s. 118].

Змены, якія адбыліся ў час Другой сусветнай вайны, закранулі і комплекс рэгламентацый, што датычыліся ўдзельнікаў пахавальнага абраду. Ранейшыя прынцыповыя прадпісанні і забароны, многія з якіх захаваліся аж да нашага часу, у перыяд вайны не мелі такога значэння. Так, напрыклад, у беларускай традыцыі капанне магілы было спецыфічна мужчынскім заняткам. Гэта асаблівасць выцякала не толькі з аб’ектыўнага падзелу працы паміж мужчынамі і жанчынамі, але і была замацавана на сімвалічным узроўні. Жанчыны не толькі не прымалі ўдзелу ў гэтай справе, але нават іх прысутнасць на могілках у час капання магілы была непажаданай [25, с. 15]. Адсутнасць мужчын у час вайны прывяла да таго, што магілы маглі капаць і жанчыны: *«Даўна ў вайну дажа бабы капалі яму. <...> А як жа ж, ні было каму. Ні знаю як дамоўі тыя хто рабіў, а сама помню, што бабы капалі»* (запісана У.Я. Аўсейчыкам у 2009 г., в. Гайдукі Пастаўскага р-на ад Януковіч Ф.І., 1936 г. н.). Калі раней строга прытрымліваліся патрабавання аб няўдзеле родных памерлага ў пахавальным абрадзе, то ў час вайны яно выконвалася не заўсёды: *«Яму не было каму выкапаць, некаму было выкапаць. Во, суседка мая, матка памёрла з вайны, а людзей не было. Сама яна яму выкапала і пахараніла матку»* (запісана У.Я. Аўсейчыкам у 2010 г., в. Шо Глыбоцкага р-на ад Пілімон Г.І., 1935 г. н.).

Такім чынам, у перыяд Другой сусветнай вайны у пахавальным абрадзе адбыліся істотныя змены, звязаныя, у першую чаргу, з аб’ектыўнай немагчымасцю выконваць абрадавыя дзеянні ў адпаведнасці з традыцыяй. Аднак такі варыянт пахавання расцэньваўся вяскоўцамі як «ненармальны» і «няправільны». У сувязі з гэтым ужо пасля вайны нават магло ажыццяўляцца перапахаванне памерлых. Неабходна адзначыць, што змены, якія адбыліся ў час вайны ў пахавальнай абраднасці, насілі часовы характар і пасля вайны іх ужо не назіраецца. Пахавальны абрад стаў праводзіцца ў адпаведнасці з мясцовымі традыцыямі.

Для ваеннага перыяду характэрным становіцца і новы тып пахаванняў – брацкія магілы. Ужо пасля вайны назіраецца рэактуалізацыя і такой формы

пахавальнага помніка як кенатаф, які ўвасобіўся ў так званых помніках загінуўшым землякам. Даволі знакавай падаецца тапаграфія такіх помнікаў (у цэнтры паселішча, каля органаў мясцовага кіравання), а таксама іх сімволіка і архітэктоніка (абеліскі, спісы імёнаў на стэлах, зоркі і г.д.), якія значна выбіваліся з традыцыйных рамак.

Асаблівасці пахавальна-памінальнай абраднасці, характэрныя для перыяду Другой сусветнай вайны, праяўляюцца і ў такім спецыфічным жанры народнай творчасці, як пахавальныя галашэнні. У гады вайны хаўтурныя галашэнні бытавалі паўсюдна. Нягледзячы на захаванне традыцыйных клішэ і мастацкіх сродкаў (рытарычныя пытанні, памяншальна-ласкальныя суфіксы і г.д.), характэрных для традыцыйных пахавальных галашэнняў, галашэнні перыяду вайны маглі адрозніваецца сваім зместам. У такіх галашэннях нярэдка малюецца вобраз героя, гаворыцца дзе і як ён загінуў. У час вайны галашэнне можна было пачуць не толькі над магіламі або целамі загінуўшых, але і пры атрыманні вестак аб смерці [4, с. 211 – 212; 17, с. 348, с. 352].

Другая сусветная вайна аказала ўплыў на памінальную абраднасць беларусаў. Гэты ўплыў праявіўся ўжо пасля вайны. У выніку з’явіўся новы яе тып – памінанне ахвяр, загінуўшых у час вайны. У Беларусі ў другой палове XX – пачатку XXI ст. стала традыцыйным напярэдадні ці ў сам Дзень Перамогі (9 мая) ускладанне вянкоў і кветак да помнікаў і брацкіх магіл партызанаў і воінаў, якія загінулі ў час вайны. У традыцыі беларускага народа ўвайшло таксама ўскладанне вянкоў да помнікаў загінуўшых воінаў у Дзень вызвалення рэспублікі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў (3 ліпеня) [19, с. 271]. У сучасны перыяд у Рэспубліцы Беларусь Дзень усеагульнай Памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны адзначаецца 22 чэрвеня [15, с. 196].

Нягледзячы на існаванне ўстаноўленага агульнадзяржаўнага дня памяці ахвяр, загінуўшых у час вайны, лакальныя асаблівасці памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння маглі аказваць уплыў на выбар часу такога памінання. Так, на Расоншчыне (в. Перавоз), дзе распаўсюджана традыцыя памінаць памерлых на Тройцу, памінанне партызана, які загінуў у час вайны, было прымеркавана менавіта да гэтага свята: *«Ай, проста, там жа* [на горцы – *А.У.*] *парцізан захаронены. Хадзілі на яго кажную Тройцу і гэтага парцізана паміналі»* (запісана У.А. Лобачам у 2009 г. в. Перавоз Расонскага р-на ад Кальнінай Л.Д., 1925 г. н.). Падобная традыцыя была зафіксавана А.І. Залескім у Шуляцінскім сельсавеце таго ж Расонскага раёна [10, с. 41].

Такім чынам, навуковы аналіз крыніц, праведзены ў працы, дазваляе зрабіць наступныя высновы: 1) нягледзячы на бачныя змены ў пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў у другой палове XIX ст., на якія звярталі ўвагу этнографы, больш істотныя змяненні ў гэтай частцы народнай культуры беларусаў адбыліся ўжо ў XX ст.; 2) змены, якія назіраліся ў перыяд рэвалюцый пачатку XX ст. хоць і з’яўляліся прынцыповымі і паказальнымі, аднак насілі фрагментарны і вонкавы характар, датычыліся канкрэтнай катэгорый памерлых (загінуўшых рэвалюцыянераў), не мелі шырокага распаўсюджвання і бытавалі пераважна ў поліэтнічным гарадскім асяроддзі, а таму не былі паказальнымі ў кантэксце традыцыйнай пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў; 3) асноўныя змены ў

пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння ў першай палове ХХ ст. адбыліся пасля ўсталявання савецкай улады, а таксама ў гады Другой сусветнай вайны; 4) змены ў пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння ў першай палове ХХ ст. прасочваюцца на трох узроўнях: у форме абрадаў (з'яўленне і распаўсюджанне грамадзянскіх пахавальных і памінальных рытуалаў), іх структуры (змены сінтаксісу абрадаў; рэдукцыя і з'яўленне новых частак), а таксама ў асобных элементах абрадаў (уяўленнях, абрадавых дзеяннях, рэгламентацыях, матэрыяльнай абрадавай атрыбутыцы, пахавальных галашэннях); 5) дынаміка змен на вызначаных трох узроўнях характарызуецца нераўнамернасцю і несінхроннасцю і ў розныя перыяды мела сваю спецыфіку.

## ЛІТАРАТУРА


1. [Б.а.] Абставіны смерці і пахавання. З гісторыі помніка // Браслаўскія сшыткі. – 2000. – №4. – С. 69 – 70.
2. 1905 год у Беларусі: зборнік артыкулаў, успамінаў і матэрыялаў / Камісія ЦВК БССР па арганізацыі святкавання 20-годдзя рэвалюцыі 1905 году; Гістпартаддзел ЦК КП(б)Б; пад рэдакцыяй М. Шульмана. – Менск [Мінск: б.в.], 1925. – VII, 109, [2] с.
3. Бачыушая. Трымаецца за папоу / Бачыушая // Віцебская сялянская газэта. – 1927. – 16 кастр. – С. 4.
4. Беларуская вусна-паэтычная творчасць: Падруч. для філал. спец. ВНУ / К.П. Кабашнікаў, А.С. Фядосік, А.С. Ліс [і інш.]. – 2-е выд., перапрац. – Мінск: Выш. шк., 1988. – 415 с.
5. Бич, М.О. Начало рабочего движения. Революция 1905–1907 гг. / М.О. Бич, Н.А. Манис // Полоцк: Исторический очерк / АН БССР. Ин-т истории; редкол.: П.Т. Петриков (отв. ред.) [и др.]. –2-е изд., перераб. и доп. – Минск: Наука и техника, 1987. – С. 111 – 120.
6. Богданович, А.Е. Пережитки древняго миросозерцания у белоруссов. Этнографический очерк / А.Е. Богданович. – Гродно: Губернская типография, 1895. – III, 186 с.
7. Бялявіна, В.М. Святы / В.М. Бялявіна, А.У. Гурко, Т.І. Кухаронак, Л.В. Ракава // Беларусы / В.Ф. Бацяеў, В.М. Бялявіна, А.У. Гурко, [і інш.]; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі. – Мінск: Бел. навука, 2002. – Т.6. Грамадскія традыцыі. – С. 299 – 598.
8. Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии. Документы и материалы. – Минск: Гос. издательство БССР, редакция политической литературы. – Т.1. Белоруссия в период подготовки социалистической революции (февраль – октябрь 1917 г.). – 1007 с.
9. Глебкин, В.В. Ритуал в советской культуре / В.В. Глебкин. – М.: Янус-К, 1998. – 167 с.
10. Залескі, А.І. Новыя звычаі і абрады – у наш быт / А.І. Залескі, У.М. Іваноў / Т-ва па распаўсюджанню паліт. і навук. ведаў БССР. – Мінск, 1960. – 63 с.
11. История рабочего класса Белорусской ССР. В 4-х т. / Ин-т истории АН БССР; редкол. тома: К.И. Шабуня (отв. ред.) [и др.]. – Минск: Наука и техника, 1984. – Т.1. Рабочий класс Белоруссии в период капитализма. – 400 с.

12. Каспяровіч, Г.І. Беларусы. Фарміраванне беларускай нацыі / Г.І. Каспяровіч // Этнаграфія Беларусі. Энцыкл. / рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелСЭ, 1989. – С. 66 – 77.
13. Клявін. Пахавалі камунара / Клявін // Віцебская сялянская газэта. – 1927. – 16 кастр. – С. 4.
14. Кухаренок, Т.И. Основные этапы и тенденции развития семейной обрядности в Белорусской ССР / Т.И. Кухаренок // Праздники и обряды в Белорусской ССР / В.К. Бондарчик, Н.И. Бураковская, Л.В. Ракова [и др.]. – Минск: Наука и техника, 1988. – С. 93 – 109.
15. Кухаронак, Т.І. Грамадзянскія святы / Т.І. Кухаронак // Беларусы: сучасныя этнакультурныя працэсы / Г.І. Каспяровіч [і інш.]; рэдкал.: А.І. Лакотка [і інш.]; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы. – Мінск: Беларус. навука, 2009. – С. 185 – 255.
16. Кухаронак, Т.І. Пахавальна-памінальныя звычаі і абрады / Т.І. Кухаронак // Беларусы / В.К. Бандарчык, Г.М. Курыловіч, Т.І. Кухаронак [і інш.]; рэдкал.: В.К. Бандарчык [і інш.]; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск: Бел. навука, 2001. – Т.5. Сям’я. – С. 351 – 369.
17. Пахаванні. Памінкі. Галашэнні / уклад. тэкстаў, уступ. артыкул і камент. У.А. Васілевіча; сістэм. і камент. напеваў Т.Б. Варфаламеевай; рэдкал.: А.С. Фядосік (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1986. – 615 с.
18. Полищук, Н.С. Обряд как социальное явление (на примере «красных похорон») / Н.С. Полищук // Советская этнография. – №6. – 1991. – С. 25 – 39.
19. Праздники и обряды в Белорусской ССР / В.К. Бондарчик, Н.И. Бураковская, Л.В. Ракова [и др.]. – Минск: Наука и техника, 1988. – 302 с.
20. Романов, Е.Р. Белорусский сборник / Е.Р. Романов. – Вильно: Тип. А.Г. Сыркина, 1912. – Вып. VIII: Быт белоруса. – VIII, 600 с.
21. Седакова, О.А. Материалы к описанию полесского погребального обряда / О.А. Седакова // Полесский этнолингвистический сборник. Материалы и исследования. – М.: Наука, 1983. – С. 246 – 262.
22. Т-ский М. Без попов / М. Т-ский // Витебская крестьянская газета. – 1925. – 19 февр. – С. 5.
23. Улашчык, М. Выбранае / М. Улашчык; Уклад. А. Каўкі і А. Улашчыка; навук. рэд. Г. Кісялёў і В. Скалабан; Прадм. і камент. А. Каўкі. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2001. – 608 с.
24. Шейн, П.В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края / П.В. Шейн. – СПб.: Тип. имп. акад. наук, 1890. – Т. I. Ч. II: Бытовая и семейная жизнь белорусов в обрядах и песнях. – XXXIV, 712, [4] с.
25. Шпилевский, П.М. Белоруссия в характеристических описаниях и фантастических ее сказках / П.М. Шпилевский // Пантеон. – 1856. – Том XXV. – Кн. I. – С. 1 – 30.
26. Sielicki, F. Region Dolhinowo–Budsławo–Krzywicki na dawnej Wilenszczyźnie. Kronika historyczna / F. Sielicki. – Warszawa–Wrocław: PWN, 1989. – 181 s.

РЕЗЮМЕ

В статье рассматривается динамика изменений в погребально-поминальной обрядности белорусов Подвинья в первой половине XX в. Особое внимание уделено анализу изменений, произошедших в данной части народной культуры в период революции 1905–1907 гг., после установления советской власти, в годы Второй мировой войны. Приходим к выводу, что изменения в погребально-поминальной обрядности белорусов Подвинья в первой половине XX в. прослеживаются на трех уровнях: в форме обрядов (появление и распространение гражданских погребальных и поминальных ритуалов), их структуре (изменение синтаксиса обрядов; редукция и появление новых частей обрядов), отдельных элементах (представлениях, обрядовых действиях, регламентациях, материальной обрядовой атрибутике, погребальных причитаниях). Динамика изменений на этих трех уровнях характеризуется неравномерностью и несинхронностью.

## SUMMARY

In the article we deal with the dynamics of changes in funeral and commemoration rites of belorussians from Dvina region in the first part of the XX century. Special attention is given to the analysis of changes happened in this part of folk culture during the period of the revolution of 1905 – 1907 years, after the October revolution, during World War II. We make a conclusion that the changes in the funeral rites of Dvina river Belarusians in the  first half of the twenties century are retraced at three levels: change of the rite forms, change in the structure of the rite, evolution of some rite elements. The dynamics of the changes at those three levels is characterized by the unevenness and non-synchronism.